# ВЯДОМЫ НЕВЯДОМЫ СКАРЫНА

**П.У. Белькевіч**

*Навуковы кіраўнік А.А. Лягчылін*

Францыск Скарына з'яўляецца адной з самых цікавых гістарычных асоб Беларусі. Гэта абумоўлена ня толькі яго дасягненнямі і ўплывам на культуру Беларусі, але ж і існаваннем розных легенд аб яго жыцці. Не гледзячы на тое, што жыццё Скарыны даследуецца ужо некалькі вякоў (існуе асобная дысцыпліна «скарыназнаўства»), у яго біяграфіі застаюцца пытанні, на якія гісторыя яшчэ не можа даць адказ. У адніх выпадках гэта немагчыма з-за адсутнасці дакументаў і іншых сведчанняў аб асобных перыядах жыцця Скарыны, у іншых выпадках гісторыкі сустракаюцца з супярэчлівымі фактамі. Мэтай гэтага артыкула будзе аналіз найбольш важных пытанняў адносна біяграфіі Скарыны.

**Сапраўднае імя.** Пытанне пачалі абмяркоўваць у 1875 годзе пасля таго, як А. Петрушкевіч прапанаваў гіпотэзу, што Скарына узяў імя «Францыск» пасля нараджэння самастойна. У якасці падставы, А. Петрушкевіч выкарастаў прывілей караля Жыгімонта Старога ад 21 кастрычніка 1532 года, у якім асветнік названы Georgij Franciscij Skorina. На пытанне, чаму асветнік названы менавіта так, А. Петрушкевіч выказаў думку, што «Георгій» з'яўляецца сапраўдным імем Скарыны. Імя «Францыск» у сваю чаргу выкарастоўвалася для паступлення у Кракаўскі ўніверсітэт, каб схаваць сваё сапраўднае імя ў выпадку існаванная дыскрымінацыі з боку адміністрацыі ўніверсітэта. Гіпотэза адтрымала вялікую падтрымку у сярэдзіне 20-га стагоддзя, тады асветніка называлі выключна Георгіем.

Супраць гэтай версіі ёсць некалькі фактаў. Па-першае, польскі даследчык Г. Лаўмянскі, даследуя грамату Жыгімонта Старога 1532 года, звярнуў увагу, што асветнік там названы як egregius Franciscus Skorina de Polocko, на падставе чаго сказаў, што пісар у дакуменце мог пераблытаць словы Georgius і egregius (г.н. шаноўны, слаўны). Па-другое, каталікі шанавалі і працягваюць шанаваць Святога Георгія разам з Святым Францыскам. Акрамя таго, ў актах універсітэта напісана, што пад час паступлення Скарыны сярод абітурыентаў былі людзі з імем «Георгій». Аднак адсутнасць матыва не азначае, што такая з'ява не магла збыцца.

Доказы, якія бы дакладна адмовілі магчымасць гіпотэзы, яшчэ не былі знойдзены, калі яны увогуле існуюць.

Веравызнанне. Яшчэ адным невядомым для нас аспектам жыцця Скарыны з'яўляюцца яго канфесійныя погляды. Адзіным дакладным доказам веравызннаня Скарыны з'яўляюцца словы архімандрыта Сялявы, які у сваёй кнізе «Антыэленхус» называў Скарыну гусітам. Але ёсць шэраг цікавых фактаў, якія даюць падставу лічыць Скарыну як каталікам, так і праваслаўным.

Скарына мог быць каталікам, бо кнігі, якія ён выдаваў, былі часткай і праваслаўнага, і каталіцкага канонаў. Таксама ў Вялікім Княстве Маскоўскім кнігі Скарыны спалілі менавіта таму, што яны былі надрукаваны на тэрыторыі каталіцкай царквы, а самаму Скарыне забаранілі ўезд як католіку. З іншага боку, Скарына мог быць праваслаўным проста з магчымай адсутнасці ў Полацку каталіцкай царквы, калі нарадзіўся Скарына. Акрамя гэтага, ён выдаваў Псалтыр такім чынам, што выкарастоўваць яго для службы маглі толькі ў праваслаўнай царкве. І яшчэ пасля вучобы ў Падуе Скарына атрымаў дыплом не ў царкве, як павінны былі атрымліваць каталікі, а ў месцы, выбраным універсітэтам Падуі. Але пры гэтым ёсць тэорыя, што Скарына быў пратэстантам – на яго спасылаліся іншыя вядомыя рэфарматары Беларусі, як Сымон Будны і Васіль Цяпінскі. У дадатак, асобнік скарынаўскай «Малой падарожнай кніжкі» з каллекцыі Брытанскай Бібліятэкі носіць на сабе экслібрыс Пауля Спэратуса, паплечніка Марціна Лютэра: ў 1524 годзе Пауль Спэратус прыбыў у Прусію па рэкамендацыі Лютэра і стаў там галоўным дзеячам рэфармацыі, а з 1530 года стаў лютэранскім біскупам Памезаніі. Як мяркуюць, Скарына ўручыў епіскапу Спэратусу гэты асобнік пры наведванні Кёнігсберга у 1530 годзе Аднак гэтага недастаткова каб упэўнена казаць нешта аб веравызнанні Скарыны.

**Сустрэча з Лютэрам.** У 1839 годзе славіст В. Копітар у адной з сваіх кніг апублікаваў артыкул «Гістарычнае пытанне аб доктары медыцынскага факультэта Прагі Францыске Скарыне, які чыніў падкопы супраць доктара Марціна Лютэра». Арыткул паведамляе аб тым, як ў 1525 годзе ў Вітэнберге Лютэр сустрэў невядомага доктара Францыска, які спачатку спадабаўся яму сваей адукаванасцю і манерамі, але потым Лютэр даведаўся ад сваіх сяброў, што Францыск плануе сапсаваць яго дзейнасць, пасля чаго папрасіў уладу горада затрымаць Францыска і пакінуў горад. Аднак Францыск змог пазбегчы катавання. Копітар лічыў, што доктарам насамрэч з'яўляўся Скарына. Але гэта нельга пацвердзіць – у архіве горада нет дакументаў, у якіх апісваецца выпадак. Тым больш В. Копітар спасылаўся на іншага гісторыка Ф. Зэкендорфа, які апісваў нейкага яўрэйскага доктара з Польшчы, які спрабаваў атруціць Лютэра. Доктара схапілі, аднак сам Лютэр пажадаў, каб злачынцу не катавалі, а адпусцілі. І ўсё ж такі даследчыкі лічаць, што гэта не быў Скарына, паколькі ў 1525 годзе ён займаўся друкаваннем у Вільне.

**Скарына як садоўнік?** Ёсць магчымасць таго, што некаторы час свайго жыцця ў Празе Скарына мог працаваць як садоўнік. У 1535 годе кароль Фердынанд вырашыў стварыць батанічны сад, для чаго пачаў пошук людзей з неабходнай адукацыяй. Аб тым, што сярод іх быў Скарына, сведычць грамаца Фердынанда ад 29 студзеня 1552 года, дзе Скарына згадваецца як «памерлы доктар Францыск Рус Скарынін з Полацка, наш садоўнік». Аднак чэшскія даследчыкі, а ўслед за імі і замежныя гісторыкі архітэктуры, прытрымліваюцца кананічнай тэорыі, што «сад на Градзе» быў закладзены ў 1534 годзе запрошанымі італьянцамі Джавані Спацыо і Франчэска Банафардэ. Блізкасць імёнаў «Франчэска» і «Францыск» спарадзіла версію аб дзейнасці Скарыны як садоўніка.

**Месца пахавання.** Месца пахвання невядома і зараз. Большасць даследнікаў лічыць, што Скарына пахваны дзесьці у Празе, бо там ён і пражыў апошнія гады. Аднак зараз даследчык А. Мальдзіс выказаў здагадку, што Скарына мог быць пахаваны ў касцёле Святога Віта ў Чэскім-Крумлаве на поўдні Чэхіі.